аўтамабілі, аўтобусы, трансфарматары электрычныя, пральныя машыны, халадзільнікі і маразільнікі.

**Падвядзём вынікі.** Мінск займае першае месца па колькасці насельніцтва сярод гарадоў краіны. Гэта вядучы цэнтр па вытворчасці трактароў, аўтобусаў, тралейбусаў, халадзільнікаў, пральных машын, інтэгральных схем, тэлевізараў, керамічнай пліткі, ваўняных тканін. Сфера паслуг перавышае 70 % у структуры ВРП горада.

***Праверце сябе.*** 1. У чым асаблівасці насельніцтва горада Мінска? 2. Назавіце галіны спецыялізацыі прамысловасці Мінска.

***Праблемныя пытанні.*** 1. Чаму асноўнай галіной спецыялізацыі Мінска з'яўляецца машынабудаванне? 2. Чаму ў Мінску высокая доля сферы паслуг у ВРП?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Вам прапанавалі выступіць на канферэнцыі. Падрыхтуйце стэндавы даклад «Мінск — найбуйнейшы цэнтр адукацыі і навукі».

## § 50. Магілёўская вобласць

***Успомніце.*** *Як уплываюць на прыродныя рэсурсы лёсападобныя адклады?*

**1. Роля вобласці ў гаспадарцы краіны.** Удзельная вага валавога рэгіянальнага прадукту Магілёўскай вобласці ў фарміраванні ВУП краіны самая нізкая і складае 7,6 % (гл. мал. 144). Магілёўская вобласць па ўдзельнай вазе ў агульнарэспубліканскім аб'ёме прамысловай вытворчасці знаходзіцца на сёмым месцы, а па вытворчасці прадукцыі сельскай гаспадаркі — на шостым (гл. мал. 145).

Па карце атласа (с. 81) вызначце ўдзельную вагу вобласці ў колькасці насельніцтва Беларусі.

**2. Геаграфічнае становішча вобласці.** Магілёўская вобласць размяшчаецца на ўсходзе Беларусі і мяжуе з Расіяй. У яе межах знаходзіцца крайні ўсходні пункт краіны. Па плошчы (29,1 тыс. км$^2$) яна пераўзыходзіць толькі Гродзенскую вобласць.

**3. Прыродныя рэсурсы.** Магілёўская вобласць характарызуецца разнастайнымі мінеральнымі рэсурсамі. Найбольшае значэнне маюць радовішчы мелу і мергелю, на базе якіх працуюць цэментныя заводы ў Крычаве і Касцюковічах. Да мелавых адкладаў прымеркаваны

радовішчы фасфарытаў і трэпелу. У Глускім раёне здабываецца нафта. Распрацоўваюцца радовішчы торфу, будаўнічых пяскоў, пясчана-жвіровага матэрыялу.

Якія формы рэльефу характэрныя для лёсападобных суглінкаў?

Шырокае распаўсюджанне лёсападобных адкладаў прывяло да ўтварэння своеасаблівых формаў рэльефу. Сельскагаспадарчыя землі займаюць больш за 42 % тэрыторыі, доля ворных зямель складае каля 30 %. Пасля аварыі на ЧАЭС вялікія плошчы сельскагаспадарчых зямель выкарыстоўваюцца з абмежаваннямі.

Успомніце, якімі паказчыкамі характарызуюцца агракліматычныя рэсурсы Магілёўскай вобласці.

Агракліматычныя рэсурсы не самыя спрыяльныя для сельскай гаспадаркі. Праз тэрыторыю вобласці з поўначы на поўдзень працякаюць буйныя рэкі чарнаморскага басейна. Буйных прыродных азёр у вобласці няма, у поймах рэк сустракаюцца азёры-старыцы. На рэках Друць і Свіслач пабудаваны Чыгірынскае і Асіповіцкае вадасховішчы.

Па картах атласа (с. 6–7, 80) вызначце, якія буйныя рэкі працякаюць у вобласці. У чым асаблівасці іх гідралагічнага рэжыму?

Магілёўская вобласць характарызуецца невысокай лясістасцю (38,9 %), якая паніжаецца з захаду на ўсход вобласці. Прыродаахоўныя тэрыторыі ў вобласці займаюць усяго 4,6 % — самы нізкі паказчык у краіне. Сярод ААПТ вылучаюцца 5 заказнікаў і 14 помнікаў прыроды рэспубліканскага значэння. Адносна няшмат у вобласці і прыродаахоўных аб’ектаў мясцовага значэння.

**4. Насельніцтва.** Па колькасці насельніцтва (981,7 тыс. чал.) Магілёўская вобласць знаходзіцца на апошнім месцы. Тут самая высокая ў краіне доля гарадскога насельніцтва (80,6 %). Сельскія паселішчы па люднасці саступаюць паселішчам Брэсцкай і Гомельскай абласцей. Шчыльнасць насельніцтва — 34 чал./км$^2$. Паводле нацыянальнага складу пераважаюць беларусы (89 %). Другое месца займаюць рускія (6 %).

**5. Прамысловасць.** Доля прамысловасці ў структуры ВРП вобласці складае 30,4 % (мал. 159). У Магілёўскай вобласці працуе больш за 1500 прадпрыемстваў. У структуры апрацоўчай прамысловасці вядучую ролю адыгрываюць хімічная і харчовая прамысловасць.

У структуры хімічнай прамысловасці найбольшае значэнне мае вытворчасць гумавых і пластмасавых вырабаў, хімічных валокнаў. Вобласць — галоўны вытворца шын у краіне.




Мал. 159. Структура ВРП Магілёўскай вобласці, 2023 г., %

У вобласці знаходзяцца два найбуйнейшыя цэнтры хімічнай прамысловасці. Магілёў спецыялізуецца на вытворчасці хімічных валокнаў і нітак, гумавых вырабаў, пластмас і вырабаў з іх, а Бабруйск — шын. Чаму хімічная вытворчасць з'яўляецца вядучай галіной прамысловасці вобласці, а найбуйнейшыя прадпрыемствы маюць такое размяшчэнне?

Магілёўская вобласць спецыялізуецца на вытворчасці мяса і мясных вырабаў, малочных прадуктаў, алею. Прадпрыемстваў машынабудавання мала. Яны размяшчаюцца ў Магілёве, Бабруйску, Асіповічах. У вобласці выпрацоўваецца амаль 100 % ліфтаў, больш за палову прычэпаў, грузавыя аўтамабілі, электрарухавікі.

Магілёўскі аўтамабільны завод імя С. М. Кірава — адно з найбуйнейшых прадпрыемстваў у СНД па выпуску аўтамабільнай і будаўнічай тэхнікі. Тут выпускаюцца аўтабетоназмяшальнікі. Больш за 60 % выпрацаванай прадукцыі пастаўляецца ў Расію.

Магілёў — адзін з найбуйнейшых цэнтраў па выпуску металургічнай прадукцыі (больш за 30 % стальных труб).

У вобласці выпускаецца 70 % цэменту і 40 % шыферу (Крычаў і Касцюковічы), бетонныя вырабы. У шматлікіх гарадах ажыццяўляецца апрацоўка драўніны і вытворчасць вырабаў з дрэва. Бабруйск з'яўляецца буйным цэнтрам мэблевай вытворчасці, а Шклоў — цэлюлозна-папяровай. Развітая тэкстыльная, швейная і гарбарна-абутковая вытворчасць. У раённых цэнтрах вобласці размешчаны льнозаводы. У вобласці створана свабодная эканамічная зона «Магілёў» з рэзідэнтамі ў Магілёве, Бабруйску, Шклове і Асіповічах.

Якія прадпрыемствы выпрацоўваюць прадукцыю машынабудавання?

Назавіце прадпрыемствы лёгкай прамысловасці.

Вытворчасць і размеркаванне электраэнергіі складае 10,6 % прамысловасці. ЦЭЦ размяшчаюцца ў Магілёве і Бабруйску. На рэках Друць і Свіслач працуюць ГЭС.

Па картах атласа (с. 52) назавіце ГЭС, якія функцыянуюць у вобласці.

**6. Структура і спецыялізацыя сельскай гаспадаркі.** У структуры ВРП вобласці на долю сельскай, лясной і рыбнай гаспадаркі прыпадае 9 %. Спецыялізуецца на мяса-малочнай жывёлагадоўлі, птушкагадоўлі, кормавытворчасці ў спалучэнні са збожжавай гаспадаркай, развітым ільнаводствам і бульбаводствам. Вобласць займае адно з апошніх месцаў у краіне па валавых зборах бульбы, ільновалакна, гародніны, рапсу, валавой вытворчасці мяса і малака. У шэрагу раёнаў спецыялізаваныя гаспадаркі займаюцца зверагадоўляй і рыбаводствам.

**7. Геаграфія сферы паслуг.** На сферу паслуг у Магілёўскай вобласці прыпадае каля 50,9 % ВРП. Амаль 7 % ВРП прыпадае на транспарт і сувязь. У вобласці развіты аўтамабільны транспарт, але па гушчыні аўтамабільных дарог з цвёрдым пакрыццём (каля 400 км/1000 км$^2$) яна пераўзыходзіць толькі Гомельскую і Брэсцкую. Праз усходнія раёны вобласці праходзяць магістральныя нафта- і газаправоды з Расіі ў краіны Еўропы.

У вобласці развітая сфера адукацыі: функцыянуюць шэсць устаноў вышэйшай адукацыі, каля 40 каледжаў і ліцэяў. У Горках знаходзіцца найстарэйшая УВА краіны — Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія. Практычна ў кожным раёне вобласці працуюць музеі. Магілёўская вобласць займае першае месца ў краіне па колькасці гісторыка-культурных помнікаў. Сярод іх больш за 800 курганоў, стаянак і гарадзішчаў.

Самыя вядомыя помнікі архітэктуры Магілёўскай вобласці: Свята-Нікольскі жаночы манастыр і Архірэйскі палац у Магілёве, палац князя Пацёмкіна ў Крычаве, палац Булгакаў у Жылічах, Бабруйская крэпасць.

Прааналізуйце карты атласа (с. 61–71) і знайдзіце аб'екты сферы паслуг вобласці.

**8. Найбуйнейшыя эканамічныя цэнтры вобласці.** **Магілёў** размешчаны ў цэнтры вобласці на рацэ Дняпро (мал. 160). Па колькасці

насельніцтва (353,3 тыс. жыхароў) ён займае пятае месца ў краіне. Адно з найбуйнейшых прадпрыемстваў — «Магілёўхімвалакно» — ажыццяўляе вытворчасць поліэфірных валокнаў і нітак (лаўсану). У Магілёве выпускаюцца таксама пластмасы і вырабы з іх, гумавыя вырабы, ліфты, грузавыя аўтамабілі, харчовыя прадукты. Па колькасці ўстаноў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ён саступае толькі Мінску і Гомелю.

Другі па колькасці жыхароў горад вобласці — **Бабруйск** (208,6 тыс. чал.) — размешчаны на паўднёвым захадзе вобласці. Галоўная галіна прамысловасці — хімічная, перш за ўсё вытворчасць гумавых вырабаў і шын. Развіты машынабудаванне, харчовая і лёгкая прамысловасць. У Бабруйску знаходзіцца адно з найбуйнейшых у краіне дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў «ФанДАК». На мэблевай фабрыцы горада вырабляецца школьная мэбля. Выпускаецца абутак і вырабы са скуры, верхняе адзенне. У горадзе шмат устаноў сферы паслуг.

**9. Знешнеэканамічныя сувязі.** У таварнай структуры экспарту пераважаюць малочная і мясная прадукцыя, шыны, ліфты, пліты драўняна-стружкавыя, тара пластмасавая, прадметы гігіены, вагоны грузавыя чыгуначныя і трамвайныя, сінтэтычныя валокны, смолы, вуглярод, мэбля.



*а*



*б*

Мал. 160. Помнікі архітэктуры Магілёўскай вобласці:
*а* — гарадская ратуша ў Магілёве; *б* — палац Булгакаў у Жылічах

**Падвядзём вынікі.** У Магілёўскай вобласці самая высокая ў краіне доля гарадскога насельніцтва. Магілёўская вобласць спецыялізуецца на вытворчасці шын, поліэфірных валокнаў і нітак, тканін з хімічных валокнаў, пластмас, цэменту, шыферу, ліфтаў, прычэпаў.

***Праверце сябе.*** 1. Якія асаблівасці геаграфічнага становішча Магілёўскай вобласці? 2. Назавіце галіны спецыялізацыі прамысловасці вобласці. 3. Назавіце галіны спецыялізацыі сельскай гаспадаркі вобласці.

***Праблемныя пытанні.*** 1. Чаму ў Магілёўскай вобласці мала прыродаахоўных аб'ектаў? Прапануйце варыянты іх стварэння. 2. У чым асаблівасці сферы паслуг вобласці?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Распрацуйце экскурсію па гарадах Магілёўскай вобласці.